**Балада М. Багдановіча “Страцім-лебедзь”**

**План- канспект урока беларускай літаратуры ў 9 класе**

**М. Ю. Лісай,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
СШ № 1 г. Скідзеля

**Задачы ўрока:**

- -раскрыць аўтарскую пазіцыю ў баладзе, дапамагчы вучням асэнсаваць яе сімвалічны змест ;
- -вызначыць ролю баладнай формы;
- -звярнуць увагу на гармонію зместу і формы ў творы, сувязь творчасці М.Багдановіча з класічнай спадчынай;
- -паказаць значэнне асобы і творчасці паэта ў беларускай літаратуры;
- -прадоўжыць працу па фарміраванні ўмення характарызаваць героя эпічнага твора,прывіваць навыкі даследчай работы;
- -стварыць умовы для развіцця эмацыянальнай сферы вучняў;
- садзейнічаць фарміраванню лепшых якасцей асобы: высакароднасці,мужнасці, самаахвярнасці, бескарыслівасці.

**Абсталяванне**:ЭСН,тэксты твораў М.Багдановіча,тэставыя заданні на камп’ютарах, заданні для груп.

**Форма ўрока:**камбінаваны ўрок

**Эпіграф :**

І ярка свеціць зорка Багдановіч Максім –
Паэзіі нашай ён лебедзь-Страцім.
К.Дзерачэнік

**Ход урока**

**1.Арганізацыйны момант.Псіхалагічны настрой**

Ісці да мэты – устаць да ўсходу
І даць зямлю адчуць нагам,
Ды, крышачы сцяну нягоды,
Ісці насуперак вятрам.

Няхай палохаюць віхуры,
Ты не мяняй кірунак свой,
Бо нават птушкі супраць буры
Сядзяць наперад галавой.
П.Броўка

**Чаму нас вучаць словы паэта?**

**2.Мэтавызначэнне**

Ужо трэці ўрок мы будзем вывучаць з вамі творчасць класіка беларускай літаратуры, зоркі беларускай паэзіі Максіма Багдановіча.

**-Тэма сённяшняга ўрока – Максім Багдановіч. Балада “Страцім-лебедзь”.**
**- Якія мэты ўрока ?**
**3.Праверка дамашняга задання**
Тэставыя заданні на камп’ютарах (2 вучні)

“Аднойчы я адкрыла для сябе Багдановіча, і мая душа назаўсёды засталася ў палоне чароўных гукаў яго паэіі”, – так напісала ў сачыненні мая самая таленавітая вучаніца Кацярына Дзерачэнік, якая праславіла нашу школу на ўсю Беларусь.Зараз яна вучыцца ў Мінску, там , дзе нарадзіўся яе любімы паэт.А мы з вамі, як і Каця,і яе равеснікі, як і дзясяткі іншых пакаленняў, таксама адкрываем для сябе Багдановіча, вывучаем жыццё і творчасць геніяльнага паэта і вучымся ў яго жыць.А што вы адкрылі для сябе ў творчасці М.Багдановіча?
**Выразнае чытанне вершаў М.Багдановіча з прэзентацыямі.**
-Мяне вельмі ўсхвалявала біяграфія М.Багдановіча, асабліва тое, што ўсё сваё свядомае жыццё ён знаходзіўся далёка ад радзімы і заўсёды сумаваў па ёй.Пра гэта верш “На чужыне”.
-Я даведаўся, што беларуская літаратура да Максіма Багдановіча не мела лірыкі кахання, якая б раскрывала духоўны свет асобы.І ў гэтым галоўная заслуга паэта. Эпілог да “Веранікі”.
Я думаю: усе пагодзяцца са мною,што вершы пра каханне, напісаныя Максімам Багдановічам, – гэта сапраўдныя шэдэўры.А інакш, ці сталі б яны песнямі?
-Пейзажныя вершы Максіма Багдановіча вядомы нам яшчэ з дзяцінства.Чытаеш іх і разумееш, што яны маглі быць напісаны толькі геніяльным мастаком слова.
-Нягледзячы на малады ўзрост, паэт часта задумваўся: “Дзеля чаго чалавек жыве на зямлі і як трэба жыць”.Пра гэта філасофскі верш М.Багдановіча “Я хацеў бы спаткацца з вамі на вуліцы…”Дарэчы, я даведалася, што гэта першы ў беларускай літаратуры свабодны верш.
**4.Знаёмства з баладай “Страцім- лебедзь”**
Пра асноўнае прызначэнне чалавека на зямлі М.Багдановіч не пераставаў думаць усё сваё жыццё.Пра гэта сведчыць і твор ,з якім мы сёння з вамі пазнаёмімся, – балада “Страцім- лебедзь”, напісаная ў канцы 1916 года.
Як вядома з біяграфіі, паэт прыехаў з Яраслаўля ў Мінск і стаў працаваць у камітэце дапамогі ахвярам вайны.
**-Якая вайна ішла ў той час? Што вы ведаеце пра яе?**
У адзін з восеньскіх дзён Максім Багдановіч прызнаўся Змітраку Бядулю(Багдановіч жыў у яго на кватэры): “Я задумаў твор на тэму біблейскага міфа.Гэтую тэму мне навеяла вайна, гібель мільёнаў і мой уласны лёс”.Размова ішла пра міф аб сусветным патопе і Ноевым каўчэгу.
-Давайце зараз нагадаем яго. (*Вучаніца коратка перадае змест міфа “Ной будуе каўчэг”.*)

Дзякуючы ЭСН,мы маем магчымасць гэта ўбачыць. (*Фрагмент маст. фільма "Ной будуе каўчэг".*)
Але аказалася, што Максім Багдановіч ведаў яшчэ з дзяцінства і фальклорны варыянт гэтага біблейскага міфа – апокрыф- **народны сказ аб "Страцім-птушцы".** Яго запісаў фалькларыст Еўдакім Раманаў і надрукаваў у "Беларускім зборніку" (1891). А гэтая кніга стаяла ў бібліятэцы Максімавага бацькі,фалькларыста і этнографа.
**-Што такое апокрыф?**
-Апавяданне па біблейскіх матывах, якое не прызнавалася царквой.
**-У назве вы заўважылі слова Страцім, ці зразумелае яно вам?**
**Страцім**-казачная птушка, пасланец Бога.
У стараславянскіх тэкстах адзначаецца: "Страцім- птушка – усім птушкам маці".
**Давайце паслухаем апокрыф аб "Страцім- птушцы".**
(*Вучаніца расказвае апокрыф.)*
**Слайд 16.**
**Узяўшы за аснову апокрыф, Максім Багдановіч напісаў свой твор – баладу "Страцім- лебедзь".**
**-Давайце паслухаем баладу.** (*Настаўнік чытае твор.*)

-Тлумачэнне незразумелых слоў:
**суворы –** суровы (суворына – знак ад раны)
**Локаць –** старадаўняя мера даўжыні (0,5 м)

**5. Праца над зместам балады "Страцім- лебедзь"**
**-Выкажыце свае ўражанні пра гэты твор.**
**-Аб чым расказваецца ў Багдановічавым творы?**
**-Як паводзяць сябе героі твора ў трагічнай сітуацыі?**
-Ной, папярэджаны богам, робіць каўчэг,робіць не толькі для сябе, але і для ўсіх птушак і звяроў, каб не звёўся іх род. А Страцім-лебедзь, адчуваючы ў сабе незвычайныя сілы, вырашыў ратавацца сам. Лебедзь адмовіўся ад каўчэга, сам уступіў у адзінаборства са стыхіяй, аднак трагічна загінуў, бо не ў сілах аказаўся трымаць птахаў.
**- Як у баладзе "Страцім-лебедзь" выявіліся падзеі Першай сусветнай вайны?**
-У творы няма канкрэтных апісанняў вайны,ваенных дзеянняў.Але разам з тым у ім намалявана карціна, якая не толькі раўназначная вайне, а яшчэ горшая за вайну,страшная катастрофа для ўсяго чалавецтва – сусветны патоп, калі выратавацца немагчыма.
Сёлета адзначаецца 73-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, другой сусветнай вайне за 20 стагоддзе, ад якой пацярпелі многя краіны свету, але, напэўна , найбольшыя страты панесла наша Беларусь – загінуў кожны трэці наш суайчыннік.Нездарма мы сёння так горача выступаем у абарону міру, бо добра помнім, якой цаной дасталася перамога.

**Сусветны патоп –** гэта сімвалічны вобраз вайны,сусветнай катастрофы, любой трагедыі , якая пагражае чалавецтву.

**- Якія яшчэ вобразы- сімвалы ёсць у баладзе**?

Лебедзь – сімвал творчага пачатку,перавагі духоўнага над матэрыяльным.
Лебедзь – горды, смелы, мужны, самаахвярны чалавек.
Страцім- лебедзь –сімвалічны вобраз галоўнай птушкі.

-Ці толькі пра лебедзя гэта балада?

Калі расшыфраваць сімволіку твора, то асноўная праблема не ва ўзаемаадносінах чалавека і Бога, як у апокрыфе, а ва ўзаемадачыненнях чалавека і калектыву, асобы і грамадства.

Ідэя – паэтызацыя самаахвярных людзей, гатовых на подзвігі дзеля высокіх мэтаў, праслаўленне мужных, смелых, гордых людзей.

**-Давайце звернемся да вызначэння жанру твора**.

Даследчыкі спачатку па-рознаму характарызавалі жанр гэтага твора: і паэма, і гераічная паэма,і верш. Але з цягам часу яго сталі вызначаць як баладу.Давайце ўспомнім, што такое балада?

Балада – сюжэтны твор казачна- фантастычнага, легендарна- гістарычнага ці гераічнага зместу.

Для гэтага ліра-эпічнага жанру характэрны драматычны, напружаны сюжэт,рамантычная прыўзнятасць , сімволіка- алегарычная вобразнасць, шырокае выкарыстанне народна- паэтычных і фальклорных сродкаў. У беларускай літаратуры першыя балады з’явіліся ў сярэдзіне 19 ст.

**-Дакажыце, што гэта балада.**

**Работа ў групах**

**Заданні групам:**

**“Практыкі”**

1.Скласці план балады.
2.Падрыхтаваць выразнае чытанне твора.

**“ Крытыкі”**

Характарыстыка галоўнага героя.

**“ Даследчыкі””**

Параўнальны аналіз твораў аб сусветным патопе (апокрыф- балада)

**Раскрываючы задуму напісання твора, які быў названы “Страцім- лебедзь”, М.Багдановіч гаварыў, што ён навеяны, не толькі вайной, гібеллю мільёнў, але і яго ўласным лёсам.У чым гэта, на вашу думку, выявілася ў паэме?**

-Аўтар перадаў свайму герою ад сябе:гордасць, самастойнасць, незалежнасць, ахвярнасць дзеля Айчыны, мужнасць.

Максім Багдановіч, працуючы над баладай, дакладна ведаў,што жыць яму засталося нядоўга, што жыццё не адорыць яго шчасцем цешыцца сваімі дзецьмі, пра што паэт так марыў.У адным са сваіх вершаў ён пісаў:

Больш за ўсё на свеце жадаю я,
Каб у мяне быў свой дзіцёнак-
Маленькая дачушка - немаўляшка,
Аня Максімаўна,

Такая прыгожанькая,
Цёпленькая, мокранькая,
З цёмненькімі валосікамі і броўкамі,
З цёмна - карымі вочкамі,
А ручкі, як перацягнутыя ніткамі.
Зусім такая, як Вы,
Калі Вы былі маленькай дзяўчынкай.

З.Бядуля ўспамінаў: “Праз некалькі дзён, калі Страцім-лебедзь быў начыста напісаны дробным бісерным почыркам, Максім чытаў мне гэты верш.
Ён чытаў усхваляваным глухаватым голасам.Канцоўку ён прагаварыў надломным тонам:

Ад усіх цяпер патомкі ёсць,
Ды няма адных – Максімавых.

Ён запнуўся і тут жа паправіўся:

Ды няма адных – Страцімавых.

Не выключана: прадчуваючы хуткую смерць, паэт разглядаў гэту баладу як сваю лебядзіную песню.
**Лебядзіная песня –** самае апошняе, звычайна найбольш значнае, праяўленне таленту, здольнасцей, дзейнасці.Паэт пакінуў нам запавет – быць гордымі,мужнымі, смелымі,самаахвярнымі ,гатовымі жыць дзеля другіх,не баяцца цяжкасцей і перашкод .

**6. Падагульненне**

Увесь маштаб творчых планаў паэта застаўся няздзейсненым. Несправядліва кароткім быў яго век.Але ўжо тое, што напісана Максімам Багдановічам, назаўсёды ўвайшло ў гісторыю літаратуры як адна з самых яркіх з’яў.
“ Колькі б ні прайшло гадоў, з імем Максіма Багдановіча заўсёды будзе паўставаць вобраз паэта магутнай сілы.І магутнасць яго ўвасобілася ў любові да роднай зямлі, да роднага слова, у светлым лірызме, філасофскім асэнсаванні жыцця, у стойкасці як асобы,…неўтаймаванасці жыццялюба, геніі мастака. Яго імя і творчасць выпрабаваліся часам і набылі неўміручасць.”

Г. Каханоўскі

Захапляючыся творчасцю Багдановіча, многія беларускія паэты прысвяцілі яму свае вершы. Паслухаем адзін з іх.

**Я. Янішчыц. “Ялта- 1917”.**

Чысты пагляд васілька
Ціха журыцца радзіме.
Чыстае поле радка
Ці не з табою, Максіме?

Чую, як мора шуміць.
Хваля тугі не адніме.
Хочацца верыць і жыць

Ці не табе, Максіме?

Белай самоты сцяна,
Дай яму лёту і сілы!
Ці не з журбы Лесуна
У Лебедзя гордыя крылы…

Скруха душу апячэ,
А ці ўзніме нягода.
Гэта спяшаецца Чэсць
У абарону народа.

Смерць, ты цікуеш дарма,
Белых галінак кіпенне.
Смерці паэта няма-
Ёсць Нараджэнне!

Песняй абвостраны слых,
Чуеш, Максім?-не ўмірае!
Гэта з табой.І для ўсіх
Зорка Венера світае.

**7. Рэфлексія**. 25 мая адзначаецца дзень памяці Максіма Багдановіча.25 мая 1917 года яго не стала.Ён пайшоў з жыцця, але засталіся яго неўміручыя творы, якія будуць хваляваць яшчэ не адно пакаленне.Давайце ўстанем, памаўчым і зададзім сабе пытанне: “Чаму я навучыўся ў Максіма Багдановіча?”

А ў сваім вершы, прысвечаным любімаму паэту, мая вучаніца напісала, чаму яна навучылася ў М.Багдановіча.

**К.Дзерачэнік. “Санет”**

Тады ты мудрым станеш, чалавек,
Калі спазнаеш, што жыццё не вечна,
І будзеш верыць і любіць сардэчна,
Калі перажывеш у момант век.

Мы ўсе да зор ляцім спрадвек, .
І гэта ісціна бясспрэчна.
Вучыў паэт: жыць трэба чалавечна,
Запомнім мы наказ яго навек.

І ярка свеціць зорка Багдановіч Максім –
Паэзіі нашай ён лебедзь-Страцім,
У жыце спелым сіні васілёк.

Напішам беззаганны свой санет,
Як вучыць запаветны твой " Вянок " -

І прыгажосць душы ўратуе цэлы свет.

Зараз вы ў 9 класе,выпускнікі, з некаторымі з вас мы расстанемся.І я хачу, каб вы  на ўсё жыццё засталіся добрымі і сумленнымі людзьмі, каб вашы душы  заўсёды былі прыгожымі.І ўсім нашым гасцям – прыгажосці і гармоніі ў душы.

**8.Падвядзенне вынікаў урока**

**9.Дамашняе заданне.**

Падрыхтавацца да напісання водгуку на адзін з вершаў Максіма Багдановіча.

.